на Дняпры". Такого рода пособий в республике пока нет.

Создан каталог местных изданий, начиная с 1990 г., который отсутствовал в областной библиотеке.

В 2000 г. поставлена задача проанализировать выпуск библиографических изданий Могилевской областной библиотеки, начиная с 1973 г. и издать соответствующий указатель. Таким образом, практика специальной группы имеет значительное углубление в плане привлечения учащихся к научно-исследовательской работе.

По окончании практики проводится научно-практическая конференция учащихся, сотрудников библиотеки, преподавателей техникума. Доклады, с которыми учащиеся выступают на этой конференции, показывают результативность проделанной работы.

Производственная практика специальной группы проводится на базе библиотек другого типа — библиотек высших учебных заведений г.Могилева.

Таким образом, все виды практик позволяют нам добиваться более высокого профессионального уровня подготовки специалистов.

**А.А.Гулак,**
**ст.выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

## УДАСКАНАЛЕННЕ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "МУЗЕЯЗНАЎСТВА І АХОВА ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ"

Не першы год студэнты спецыяльнасці "музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры" накіроўваюцца на вытворчую практыку ў вядучыя музеі рэспублікі. За гэты час акрэсліліся пэўныя праблемы ў яе арганізацыі і правядзенні.

У адпаведнасці з загадам № 263 ад 15.09.1997г. "Аб зацвярджэнні баз практыкі навучання студэнтаў Беларус-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кага універсітэта культуры" ў пералік баз практыкі ўваходзяць: Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Гісторыка-культурны запаведнік "Заслаўе", Музей старажытнай беларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі, Літаратурны музей М.Багдановіча, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы.

У працэсе кантактаў з кіраўніцтвам і супрацоўнікамі названых музеяў высветлілася, што не заўсёды нашыя студэнты з'яўляюцца жаданымі гасцямі ў гэтых установах культуры. У Нацыянальным мастацкім музеі традыцыйна практыкуюцца студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў. Кіраўніцтва Музея старажытнай беларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук выбірае практыкантаў з улікам асабістых кантактаў, ранейшых напрацовак (звычайна ў музей ІМЭФ НАН Беларусі трапляе не больш за два чалавекі). Літаратурны музей М.Багдановіча, па сутнасці, не можа прымаць нашых студэнтаў. Як патлумачыла галоўны захавальнік фондаў В.Ф.Бяляўская, у гэтым музеі наогул малы штат, таму вылучыць адзінку для заняткаў і кантролю за практыкантамі немагчыма.

Каб пазбегнуць аднастайнасці і дублявання, выкладчыкі кафедры вымушаны ўладкоўваць студэнтаў у іншыя музеі. У гэтым навучальным годзе група студэнтаў IV курса трапіла на практыку ў Музей-архіў літаратуры і мастацтва. Па словах Ф.В.Корзуна, архівіста аддзела інфармацыйных сістэм, узровень падрыхтоўкі нашых студэнтаў, іх зацікаўленасць і стараннасць стварылі добрае ўражанне. Сведчаннем таму з'яўляецца пісьмовая падзяка, накіраваная ад імя дырэктара на кафедру. Такім чынам, ёсць падставы спадзявацца на далейшыя творчыя стасункі кафедры з калектывам музея-архіва.

З Дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны супрацоўніцтва не атрымліваецца. Там фактычна адмаўляюцца прымаць нашых студэнтаў-практыкантаў з-за



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наяўнасці ў фондах зброі ды іншых "вайсковых" экспанатаў, якія вымагаюць павышаных мер бяспекі.

Аднак асноўнай прычынай, што надзвычай ускладняе арганізацыю вытворчай практыкі, з'яўляецца адсутнасць фінансавання, аплаты музейным работнікам кіраўніцтва практыкай. Наспела неабходнасць вырашэння гэтага пытання, бо зараз у музеях з нашымі студэнтамі працуюць "на энтузіязме", што само па сабе з'яўляецца загannай практыкай. Гэта пацвярджаюць і вынікі ананімнага апытання студэнтаў.

На пытанне : "Як да Вас ставіліся супрацоўнікі музеяў на практыцы?" — 90% адказалі: "Нас не чакалі, мы былі лішнія, мы былі не патрэбныя, нас цярпелі". І толькі 10% апытаных далі адказ: "Ставіліся добра, нас вучылі".

Аднак мэтазгоднасць вытворчай практыкі для студэнтаў не выклікае сумнення. На пытанне: "Ці патрэбная, на вашу думку, музейная практыка?" — 96% адказалі — "так", а 4% — "не".

На пытанне: "Як змяніліся пасля практыкі вашы адносіны да абранай спецыяльнасці?" — 52% адказалі — не расчараваліся, 18% — непрыемна ўразіў матэрыяльна-тэхнічны стан музейных устаноў, 30% — расчараваліся.

На пытанне: "Які станоўчы досвед вы атрымалі?" — студэнты адказалі, што азнаёміліся з разнастайнымі музеямі, са шматлікімі экспазіцыямі і фондамі, рэжымам захавання і працай закупачных камісій, навучыліся ствараць пашпарты, працаваць з картатэкамі, каталогамі і інш.

На пытанне: "Які адмоўны досвед вы атрымалі?" — студэнты адказалі, што пераканаліся, што не валодаюць музейнымі камп'ютэрнымі праграмамі.

Найбольш эфектыўнай і цікавай, як паказвае апытанне, студэнты лічаць выязную практыку. За гады навучання пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры яны мелі магчымасць азнаёміцца з музеямі абласных цэнтраў, а таксама Полацка, Міра, Нясвіжа, помнікамі архітэктуры Крэва, Гальшан. Па выніках выязной практыкі рабіліся універсітэцкія насцен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

газеты, неаднаразова друкаваліся артыкулы ў газеце "Наша слова".

Падагульняючы вопыт выкладчыкаў кафедры, думкі студэнтаў і меркаванні, якімі падзяліліся з намі супрацоўнікі музеяў, можна сцвярджаць, што вытворчая практыка — дзейсны сродак навучання і выхавання.

Дзеля большай яе эфектыўнасці плануецца працягваць выезды ў вядучыя музеі рэспублікі. Лічым неабходным вырашыць пытанне аплаты працы музейных работнікаў з нашымі студэнтамі. Гэта дасць магчымасць не абмяжоўвацца "бясплатнымі" базамі практыкі, а накіроўваць студэнтаў у рознапрофільныя музеі. Надзвычай актуальным таксама з'яўляецца закранутае вышэй пытанне спецыялізаванай (музейнай) камп'ютэрнай адукацыі студэнтаў.

**С.В.Гуткоўская,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## ФОРМЫ КАНТРОЛЮ ЗА ПЕДАГАГІЧНАЙ І ТВОРЧАЙ ПРАКТЫКАЙ СТУДЭНТАЎ: ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНЫ ПАДЫХОД

Творчая і педагагічная практыка з'яўляецца спецыяльнай формай вучэбнага працэсу, які забяспечвае студэнтам кафедры харэаграфіі Беларускага універсітэта культуры магчымасць атрымання прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў непасрэдна ў харэаграфічных школах, студыях, ансамблях, клубах бальнага танца пры выкананні абавязкаў балетмайстра, рэпетытара, педагога, трэнера. Дасягненне мэт навучання немагчыма без пэўнай практычнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі для работы ў галіне харэаграфічнага мастацтва. Галоўная мэта вытворчай і педагагічнай практыкі — замацаванне тэарэтычных ведаў студэнтаў у працэсе засваення імі прафесійнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ